*byłby prorokiem, / Ale nie jest prorokiem, bo ma inne zajęcie, / Powiada przewiązując pomidory: / Innego końca świata nie będzie, / Innego końca świata nie będzie» («Толькі сівы стары, які быў бы прарокам, / Але не з'яўляецца прарокам, бо ў яго іншыя справы, / Кажа, падвязваючы памідоры: / Іншага канца свету не будзе, / Іншага канца свету не будзе»).*

Такім чынам, мы бачым на прыкладах двух аўтараў розных сацыяльных узроўняў, што рамантызм сустракаецца і ў творчасці аўтараў розных краін у XX стагоддзі на абсалютна розных этапах развіцця канкрэтных літаратур. Да можна прывесці і шматлікіх сучасных аўтараў, напрыклад, Л. Рублеўская, Н. Бабіна, Я. Вішнеўскі, творчасць якіх паказвае на наяўнасць шырыні рамантычных тэндэнцый у літаратуры, якія існуюць і ў наш час.

## Літаратура


1. *Валери, П.* Об искусстве / П. Валери. – М. : Искусство, 1976. – 622 с.
2. История польской литературы : в 2 т. / Акад. наук СССР. – М. : Наука, 1968. – Т. 1. – 616 с.



*З. П. Мельнікава (Беларусь)*


# МАСТАЦКА-ФІЛАСОФСКАЕ АСЭНСАВАННЕ ЛЁСУ ЧАЛАВЕКА І НАРОДА Ў КАНТЭКСЦЕ ГІСТАРЫЧНЫХ ПАДЗЕЙ У ПАЭМЕ МАКСІМА ТАНКА «ЯНУК СЯЛІБА»

У творчасці кожнага таленавітага мастака, як правіла, увасабляюцца важныя для самога творцы, для народа, а часта і для ўсяго чалавецтва ісціны, маральныя імператывы, духоўныя ідэі і прынцыпы, якія маюць непераходзячае значэнне. Іх называюць вечнымі каштоўнасцямі. Гэта, звычайна, хрысціянскія, этычныя, духоўна-эстэтычныя катэгорыі – маральнасць, сумленнасць, гуманізм, дабрыня, жыццё, справядлівасць, подзвіг, ісціна і іншыя. Часта канкрэтна-гістарычныя прычыны, якія падштурхнулі аўтара да напісання твора і сталі яго асноўным зместам, страчваюць сваю актуальнасць для новых пакаленняў рэцыпіентаў. Але твор застаецца запатрабаваным і праз многа дзесяцігоддзяў і нават стагоддзяў, бо ў ім увасоблены вечныя, хвалюючыя людзей ва ўсе часы праблемы, ісціны, ідэі. Сцвярджэннем вечных каштоўнасцей вызначаюцца творы нацыянальнай і сусветнай класікі, і гэта забяспечнае іх нязменную філасофска-эстэтычную і рэцэптыўную актуальнасць. Увасабленне каштоўнасных дамінант у творы адбываецца праз мастацкую рэалізацыю аўтарам канцэптаў высокага, узвышанага, прыгожага – устойлівых паняццяў класічнай эстэтыкі. У сучасным

літаратуразнаўстве пад высокім і ўзвышаным разумеецца пафас твора з сістэмай мастацкіх сродкаў увасаблення ідэальнага, маральнага, гуманістычнага, прыгожага, гераічнага і г. д. у змесце і сэнсавай прасторы твора. Вядомы тэарэтык Ю. Бораў высокае, узвышанае, прыгожае справядліва называў агульналюдскімі каштоўнасцямі, эстэтычнымі якасцямі мастацтва, у тым ліку і літаратуры, якія маюць станоўчае грамадскае значэнне і ўтрымліваюць у сабе вялікі патэнцыял [1, с. 61]. Антыподам узвышанаму ў літаратуры і мастацтве з'яўляецца нізкае (агіднае). Гэта – непрымальныя, амаральныя якасці і ўчынкі герояў твора, якія не адпавядаюць маральна-гуманістычным ідэалам народа і чалавецтва. Нізкае таксама з'яўляецца эстэтычнай якасцю, якая мае негатыўную канатацыю, бо ўтрымлівае папярэджанне аб пагрозе, небяспецы, недапушчальнасці з'яў, якія нясуць гвалтоўную смерць, здраду, зло. У літаратурным творы носьбітамі нізкага часта могуць быць героі чужынцы, акупанты, здраднікі, тыраны. Сучаснае літаратуразнаўства актыўна звяртаецца да гэтых і іншых філасофска-эстэтычных паняццяў і катэгорый і пры дапамозе іх абнаўляе інструментарый і метадалогію даследавання, у тым ліку аксіялагічных падыходаў.

Паэма Максіма Танка «Янук Сяліба», напісаны ў сярэдзіне мінулага стагоддзя, выразна ўвасабляе вострыя, хвалюючыя як грамадскія, так і асабісталюдскія праблемы свайго часу: гераічныя і трагічныя старонкі народнага змагання з захопнікамі і здраднікамі ў час вайны на беларускай зямлі, імкненне працавітых беларусаў да мірнай стваральнай працы, мары людзей аб агульнай шчаслівай будучыні. Увасабленне іх складае канкрэтна-гістарычны змест твора, які мае важнае пазнавальнае значэнне для чытачоў нашых дзён, бо тыя эпоха і падзеі чытачам XXI ст. здаюцца далёкай гісторыяй.

Адметным філасофскім універсалізмам праблематыкі вылучаецца паэма Максіма Танка «Янук Сяліба», нягледзячы на выразны канкрэтны гістарызм зместу. Аўтар звяртаецца да вечных, дыскусійных праблем – прызначэнне мастацтва ў жыцці народа, місія творцы, чалавека, адоранага талентам. Максім Танк гарманічна спалучае адлюстраванне часовага, канкрэтна-гістарычнага з філасофскімі роздумамі аб вечным, народным, незнішчальным, далучаючы рэцыпіента да асэнсавання філасофскіх уяўленняў аб фундаментальных прынцыпах чалавечага і грамадскага быцця, да маральна-філасофскіх імператываў высокага і нізкага ў жыцці.

Філасафізм творчасці гэтага вялікага паэта стаў адной з вызначальных характарыстык яго мастацкага свету. Маштабнасць таленту, уменне ліра-эпічнымі сродкамі перадаць драматычнае жыццё беларусаў у час акупацыі, услаўленне гераізму народа-змагара панарамна і цэласна выяўлена ў паэме «Янук Сяліба». І гэта складае актуальны для свайго часу, канкрэтна-гістарычны пласт твора. Аўтар знаёміць рэцыпіента з рэальным месцам і часам падзей: былая заходнебеларуская вёска Чырвоны Лог, гады акупацыі. Да эпічна-рэальнага пласта падзей паэт актыўна падключае сюжэты і вобразы сімваліка-алегарычнай канатацыі, якія ўтвараюць універсальна-філасофскі змест твора. Гэта дасягаецца багатай вобразна-алегарычнай сістэмай паэмы: музыка, скрыпка, воўк, птушка,

роднае гняздо, хрысціянска-біблейскія матывы раю, пекла, здрадніка-юды, д’ябла (чорта) і інш. Аўтар уводзіць у структуру твора сэнсава-важныя паданні і легенды. Так, напрыклад, сталы вясковец Рыгор расказвае пра сваю сустрэчу з чортам, пра тое, як ён перахітрыў нячысціка і не дазволіў завалачы сябе ў пекла. Гэты сюжэт у першай частцы твора ўзмацняе ідэю непераможнасці, нязломнасці духоўнай сілы народа, які адолеў самога чорта, а значыць, пераможа і акупантаў, адолее ўсё.

Максім Танк паэтызуе родны край, месца падзей, сцвярджае, што мірнае жыццё – найвялікшая каштоўнасць для беларусаў. У творы шматгранна, праз багатую тыпалогію герояў увасабляецца канцэпцыя чалавек і народ. У паэме многа герояў. Асобную сюжэтную лінію складае канфліктнае супрацьстаянне герояў-антыподаў Янука і Гарыдаўца. Аўтар апісвае вясковы дружны, братэрскі гурт, дзе сямейнікі, родзічы, суседзі, аднавяскоўцы – усе свае: галоўныя героі Янук і Раіна, Васіль, каваль Таўкач, фельчар Заруба, браты Лукаш і Ігнат, іншыя. Своелюдзі, як вынікае з праблематыкі твора, – маральна-каштоўнасная катэгорыя, якая ўвасабляе кроўную і духоўную блізкасць паміж беларусамі. Гэты гарманічны людскі гурт аўтар «прадстаўляе» ў першых эпізодах твора – на вяселлі Янука і Раіны. Толькі адзін Гарыдавец вылучаецца панурасцю, скрытнасцю, зайздрасцю, прыхаванай нянавісцю да шчаслівых людзей, бо яму адмовіла Раіна. Ён – чужы сваім аднавяскоўцам, суседзям, прагне смерці Янука і на вяселлі кідаецца на шчасліўца з нажом. Нават кроўныя сваякі Гарыдаўца, які супрацьпаставіў сябе вясковай сябрыне, асуджаюць злосніка: яго родзіч Мітрафан, «На лаве стоячы, крычаў: – Баран! / Пашто на сцены лезеш п’яным лбом? / Ляці, пакуль не позна, уцячы!» [2, с. 185]. Рэўнасць і крыўда прывялі Гарыдаўца ў час вайны да здрады, ён стаў чужынцам сваім людзям. Так праз вобраз гэтага героя аўтар увасабляе канцэпцыю нізкага ў маральна-этычным абліччы чалавека. Прымітыўны, амаральны чалавек не можа пераадолець уласны эгаізм і выбірае помсту (складае для фашысцкіх акупантаў спісы «бальшавікоў», уключаючы туды дзяцей, жанчын, старых і, вядома, Янука Сялібу).

На працягу ўсяго твора аўтар шматгранна рэалізуе аксіялагічны канцэпт свае і чужынцы, падкрэслівае, што беларускі народ – як сцяна, дружна паўстаў супраць чужынцаў і «сваіх» здраднікаў.

Аўтарская канцэпцыя асобы станоўчага героя, несумненна, увасоблена на вобразе Янука Сялібы, што падмацавана і назвай твора. Максім Танк робіць наратарскае адступленне, даводзіць, што герой яго не ідэальны, не прыхарошаны, а самы звычайны вясковы хлопец. Паведамляецца гісторыя жыцця Янука: служыў у паноў падпаскам, рыбачыў, плыты па Нёмане ганяў, быў сярод кобрынскіх паўстанцаў, да 1939-га некалькі год сядзеў у астрозе… Выяўляецца пэўны аўтабіяграфізм, бо і сам паэт змагаўся за правы народа, грамадзянскую сталасць здабываў таксама праз астрожны вопыт: «Жыццё было настаўнікам ліхім, / Але нішто не пагасіла ў ім / душы паэта, / палкую любоў, / Якую ў сэрцы ён збярог, пранёс, / Любоў да бацькаўшчыны, да сяброў, / Да родных ніў, / узгоркаў / і бяроз…» [2, с. 187].

Этычна-каштоўнаснае мысленне і філасафізм творцы выяўляюцца рознымі спосабамі і прыёмамі. У прыватнасці, Максім Танк звяртаецца да прыёму сімволікі сноў. Галоўнаму герою, Януку, сніцца сон, што яго антыпод, Гарыдавец, зносіць каменне на Янукова поле і намагаецца перакаціць сонца на свой шнур, каб яно належала толькі яму аднаму. А Янук імкнецца ўзняць сонца высока над зямлёй, каб яно свяціла ўсім і саграvала ўсіх людзей. Так аўтар алегарычна ўвасабляе высокае і нізкае ў міжлюдскіх і грамадскіх адносінах. Маральна-філасофскі патэнцыял утрымлівае шэраг эпізодаў паэмы. Сярод іх – сюжэт аблавы на ваўка, якую арганізуе старшыня калгаса Лукаш. Гэты рэалістычны эпізод напоўнены сімвалічным падтэкстам. Варта падкрэсліць эпічнасць героя: ён не проста старшыня калгаса і паважаны ўсімі паляўнічы, але яшчэ і лекар-знахар, які ведае сілу зёлак і траў роднай зямлі. Гэта – герой з народа, як і некаторыя іншыя, вылучаецца менавіта былінnай эпічнасцю. Пра яго хадзіла слава як пра добрага чараўніка, які ўмеў сваім свістам склікаць птушыныя вырaі. Народнае паляванне герояў твора на ваўка закончылася няўдачай: параненаму драпежніку ўдалося ўцячы. Такім чынам аўтар праектуе ёмісты падтэкст твора: сапраўдным драпежнікам успрымаецца Гарыдавец, які на аблаве хоча застрэліць саперніка Янука, а ў час вайны адкрыта пераходзіць на бок чужынцаў; вераломным драпежніцтвам у лёсе герояў твора і ўсяго народа асэнсоўваецца вайна, уварванне якой у мірнае жыццё становіцца зместам наступнага за паляваннем раздзела.

Мастацка-філасофская прастора твора сімвалізуецца і паглыбляецца праз пазасюжэтнае паданне пра палескага музыку Куліка, якое расказвае персанаж-наратар столяр Банадык. Героі твора Бог і чорт спрачаюцца, каму павінна служыць мастацтва. І Бог цэніць Музыку, заве яго ў рай, бо яго чароўныя мелодыі былі «святлом, / што азарае дзень, / … слязой, / якая гасіць гнеў, / … малітвай / за грахі людзей / І гімнам, праслаўляючым мяне» [2, с. 189].

І чорт рады даць Музыку лепшае месца ў пекле. Нячысцік пярэчыць Богу: Музыка складаў гімны, але не Богу, а зямлі і працы сейбіта, які ўставаў раней за Бога, і сонцу, якое грэе і дае жыццёвыя сілы; а яшчэ Музыка часцей, чым у храм, хадзіў у карчму: «Дзе хто жаніўся або паміраў, / Дзе хрэсьбіны хто на сяле спраўляў, – / Там з мужыкамі ён гарэлку піў, / Нас лаяў ды іграў ім крыжачка, / Аж лапці хмарай уздымалі пыл. / Нашто табе гуляка-музыкант?» [2, с. 189].

Бог і чорт прыйшлі да пагаднення: няхай Музыка сам выбірае – рай ці пекла, бо ўсюды ён будзе ў пашане. Усемагутныя, яны даюць музыку Куліку права на самастойны выбар. А Музыка выбірае родны край, бедную Бацькаўшчыну. Так паэт вызначае і акрэслівае ўласную канцэпцыю прызначэння мастацтва, літаратуры, падтрымліваючы годны, высокі выбар героя – быць са сваім народам і служыць яму. Такая маральна-філасофская выснова пра місію мастака адпавядала аўтарскай пазіцыі. Нялёгкі маральны выбар – каму служыць? – і ў таталітарны савецкі, і ў ваенны час павінен быў зрабіць кожны чалавек. Такі выбар паўставаў неаднойчы перад сумленнымі беларускімі творцамі і асабіста перад Максімам Танкам. Штодня ён паўстае і перад сучаснікамі. Гэтая праблема

вырашаецца героем твора і аўтарам у гуманістычным рэчышчы, што ўзмацняе надчасавае і заўсёды актуальнае яго гучанне.

Збянтэжаныя нечаканым выбарам героя-Музыкі, Бог і чорт паслалі за ім смерць, каб вярнуць Куліка і мець над ім уладу. Але і смерць адступае перад Музыкам: ён змог пераканаць яе, што павінен заставацца са сваім народам, каб прыносіць радасць і суцяшэнне людзям. Так таленавіта, арыгінальна распрацоўваючы народныя вобразы і сюжэт, Максім Танк выяўляе ўласны творчы маніфест – служыць свайму народу, радавацца і смуткаваць з ім. Толькі такое мастацтва непадуладнае смерці.

Як можна пераканацца, паэме Максіма Танка «Янук Сяліба» ўласціва філасофская рэфлексія, якая прысутнічае як важны ідэйна-сэнсавы элемент, як сведчанне глыбіні і ўніверсальнасці аўтарскай задумы. Многія мастацкія вобразы маюць глыбокі сэнс, выяўляючы агульначалавечы вопыт, грамадскія адносіны, у якіх дзейнічае асоба. Творца арыгінальна выяўляе ідэйную задуму, увасабляе думкі аб уласным разуменні быцця: жыцця і смерці, дабра і зла, любові і нянавісці. Пісьменнік сцвярджае філасофскія ісціны праз канцэпцыю і тыпалогію герояў, праз сюжэт, пазасюжэтныя элементы, праз шматлікія адсылкі да беларускай міфалогіі і фальклору. Паэма «Янук Сяліба» Максіма Танка пераканаўча ілюструе беларускі этычна-каштоўнасны тып мыслення, важнымі складнікамі-канцэптамі якога з’яўляюцца праўда, справядлівасць, маральнасць, быццё ў працы на зямлі, гарманічнае суіснаванне з прыродай.

## Літаратура


1. *Борев, Ю. Б.* Эстетика / Ю. Б. Борев. – 4-е изд., доп. – М. : Политиздат, 1988. – 496 с.
2. *Танк, М.* Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012. – Т. 7 : Паэмы. – 2008. – 368 с.


*Т. М. Мельнікава, С. С. Харанека (Беларусь)*

# ТЫПЫ КАНСТРУКЦЫЙ З ЭЛІПСІСАМ ДЗЕЯСЛОВА Ў ТВОРЧАСЦІ М. ТАНКА

Творчасць Максіма Танка дае багаты матэрыял для даследавання ў галіне літаратуразнаўства, мовазнаўства. Наша ўвага прыцягнута да канструкцый з эліпсісам дзеяслова ў паэзіі беларускага пісьменніка. Аналіз сутнасці дынамічнага сінтаксісу, яго з’яў і заканамернасцяў іх функцыянавання з улікам антрапацэнтрычнага характару сінтаксічных працэсаў у лабараторыі М. Танка дазволіць па-новаму паглядзець на яго творчасць.